Водгук на аўтарэферат дысертацыі
**Талмачовай Святланы Аляксандраўны**
"Мясцовыя органы дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрнай палітыкі расійскага урада на тэрыторыі Беларусі (1861–1914)",
прадстаўленай на суісканне вучонай ступені доктара гістарычных навук па спецыяльнасці 07. 00. 02 – айчынная гісторыя

Дысертацыйнае даследаванне С. А. Талмачовай прысвечана класічнай для гістарыяграфіі праблематыцы – дзяржаўным інстытутам, што заўседы захоўвае актуальнасць. У сувязі з развіццем нацыянальнай беларускай гістарыяграфіі і метадалагічнымі трансфармацыямі ў сучаснай гістарычнай навуцы дадатковую актуальнасць набывае не толькі стварэнне ўласна наратыва, але і пераасэнсаванне ўжо існуючых падыходаў і праблемнага поля даследаванняў.

Заслугоўвае увагі прадмет разгляду С. А. Талмачовай – менавіта тыя дзяржаўныя інстытуцы, якія ажыццяўлялі сувязь грамадства (сялянства, што складала абсалютную большасць насельніцтва Расійскай імперыі), і ўлады, якая на працягу звыш паловы стагоддзя ажыццяўяла аграрную мадэрнізацыю. Даследаванне "прывадных рамянеў", што прыводзілі ў дзеянне механізм рэформ на месцах, мясцовых умоў і рэакцыі на урадавыя распараджэнні прадстаўляецца не толькі цікавым але і, без перабольшавання, карысным і павучальным нават зараз. Гэта тым больш каштоўна пры паралельнай дэманстрацыі спецыфікі не толькі заходніх губерній у цэлым, але і іх заходніх і усходніх рэгіенаў.

Прапанаванае даследаванне стварае цэласную карціну рэалізацыі аграрных ператтварэнняў ў Расійскай імперыі ў парэформенны час, у дысертацыі пераканаўча даказана, што адмена прыгоннага права не была аднамомантнай з'явай, а ўяўляла сабой бесперапынны комплексны працэс, які разгортваўся стадыяльна, меў сваю унутраную логіку і структуру і быў уключаны ў мясцовы сацыяльна-палітычны кантэкст. Патрэбна адзначыць вялізарны вопыт даследчыка і маштабнасць выкананай працы – першая публікацыя па разглядаемай тэме выйшла яшчэ ў 2003 г.

Прызнаючы несумненную актуальнасць і навуковую каштоўнасць дысертацыйнага даследавання, было б, тым не меньш, пажадана ўдакладніць некаторыя пытанні.

Так, у аўтарэфераце аўтар неаднаразова выказвае ацэначныя меркаванні (напрыклад, на с. 29: "недастатковая эфектыўнасць работы названых інстытуцый (губернскіх па сялянскіх справах прысутнасцей – Л. Л.) прывяла да далейшага рэфармавання мясцовых па сялянскіх справах устаноў"; с. 31: "шматлікія нараканні з боку мясцовых улад і скаргі насельніцтва на дзейнасць земскіх участковых начальнікаў" і г.д. На жаль, фармат аўтарэферата не дазваляе высветліць, наколькі дадзеныя высновы

падмацаваныя эмпірычным матэрыялам. Незалежна ад таго, як дадзены аспект вытрыманы ў дысертацыі, можна сцвярджаць, што вывучэнне рэакцыі "знізу" на ўрадавыя мерапрыемствы з далучэннем усяго масіву крыніц прадстаўляецца перспектыўным кірункам паглыблення разглядаемай тэмы ў рэчышчы "грамадства і ўлада", "асоба і ўлада" і г.д.

Узнікае пытанне, якімі крытэрыямі аўтар кіраваўся пры вылучэнні двух асноўных тыпаў крыніц – неапублікаваных матэрыялаў справаводства і апублікаваных дакументальных матэрыялаў (с. 22–23). Крыніцы падзяляюцца, згодна з крытэрыем апасродкаванасці, на дакументальныя і наратыўныя. Пры гэтым апублікаванасць ці неапублікаванасць крыніцы, папяровы ці электронны яе носьбіт на сутнасці крыніцы не адбіваюцца.

Перыядызацыя гістарыяграфіі, прапанаваная аўтарам, у цэлым не выклікае пярэчанняў, аднак не зусім зразумела логіка наступнай фразы: "Публікацыі па тэме дысертацыі падзелены на дарэвалюцыйныя, савецкія і працы, якія былі падрыхтаваныя ў незалежных рэспубліках на постсавецкай прасторы і ў заходняй гістарыяграфіі да 2022 г." (с. 13). Заходняя славістыка існавала і ў эпоху СССР, і існуе зараз, але чамусці яна вылучана менавіта для характарыстыкі сучаснага перыяда.

Трэба адзначыць, што выказаныя заўвагі не могуць істотна паўплываць на высокую ацэнку праведзенай даследчыкам працы. Аўтарэферат дысертацыі падрыхтаваны у адпаведнасці з існуючымі патрабаваннямі, а Талмачова С. А. безумоўна заслугоўвае атрымання вучонай ступені доктара гістарычных навук.

Доктар гістарычных навук, дацэнт,
прафесар кафедры гісторыка-культурнай спадчыны
Беларускага дзяржаўнага універсітэта
культуры і мастацтваў Л. У. Ландзіна

Отдел правовой и кадровой работы

Подлинность подписи удостоверяю
Ведущий специалист отдела правовой и кадровой работы Ю.А.Рыбакова
15.05.2023